роль знаний в игровой форме. По итогам работы на данной платформе результаты всех участников ранжируются и позволяют оценить знания в том числе по критерию оперативности. Участник викторины должен не только правильно ответить на предложенный вопрос, но и быть максимально быстрым в выборе ответа для того, чтобы занять лидирующую позицию.

Таким образом, контрольно-измерительные материалы рассматриваются нами как важный системообразующий элемент системы дистанционного обучения взрослых. Их разнообразие, вариативность, поэтапное использование позволяют эффективно взаимодействовать даже в режиме онлайн-взаимодействия, повысить уровень подготовки слушателей переподготовки.

**Список использованных источников**

1. Тавгень, И. А. Дистанционное обучение: опыт, проблемы, перпективы [Электронный ресурс] / И. А. Тавгень. – 2-е изд. – Минск : Электронная книга БГУ, 2004. — 1 электрон. опт. диск (CD-ROM).

2. О дистанционном обучении [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://e-asveta.adu.by/index.php/distancionni-vseobuch/o-dist-obuchenii. – Дата доступа: 24.10.2021.

3. Шеститко, И. В. Технология видеоанализа в обучении: фильмы для учителей и об учителях, детях и их родителях / О. В. Клезович, И. В. Шеститко // Пачатковая школа – 2021. – № 4. – С. 48–51.

УДК 371.146

# УРОК ДЛЯ ДАРОСЛЫХ ЯК ЭФЕКТЫЎНАЯ ФОРМА АЗНАЯМЛЕННЯ ПЕДАГОГАЎ З АСАБЛІВАСЦЯМІ ВЫКАРЫСТАННЯ СТРАТЭГІІ АКТЫЎНАЙ АЦЭНКІ

*Н. М. Балбатун,*
ДУА «Сярэдняя школа № 40 г. Гродна»,
Рэспубліка Беларусь,
e-mail: nbalbatun@gmail.com

У артыкуле раскрываецца сутнасць аўтарскага падыходу да выкарыстання стратэгіі актыўнай ацэнкі на ўроках беларускай мовы,

прадстаўлена аўтарскае бачанне асаблівасцей выкарыстання стратэгіі актыўнай ацэнкі.

**Ключавыя словы:** актыўная ацэнка, кампетэнцыя.

The article reveals the essence of the author's approach to the use of active assessment strategy in Belarusian language lessons, presents the author's vision of the features of the use of active assessment strategy.

**Keywords:** active assessment, competence.

Актыўная ацэнка (АА) – тэхналогія навучання, заснаваная на зваротнай сувязі. Яна з'яўляецца найлепшай для паляпшэння матывацыі і вучнёўскіх дасягненняў. Актыўная ацэнка вучыць несці адказнасць за сваё навучанне [2, с. 18].

Стратэгія актыўнай ацэнкі найбольш паспяхова працуе на фарміраванне вучэбна-пазнавальнай кампетэнцыі. «Мы вучым таму, з дапамогай чаго вучым». Сэнс адукацыі заключаецца ў тым, каб развіваць у вучняў здольнасць самастойна прымаць рашэнні на падставе атрыманага вопыту [2, с. 33].

З мэтай фарміравання ключавых кампетэнцый па праблеме выкарыстання актыўнай ацэнкі педагогамі на ўроках беларускай мовы, намі быў распрацаваны майстар-клас. Прадстаўляем сцэнарый майстар-класа, які грунтуецца на такой форме правядзення работы, як урок для дарослых.

### Сцэнарый майстар-класа «Урок для дарослых»

*Мэта:* актуалізацыя ведаў удзельнікаў майстар-класа пра сутнасць паняцця «актыўная ацэнка»; магчымасці прымянення асноўных складальнікаў стратэгіі актыўнай ацэнкі на ўроках мовы.

*Час правядзення майстар-класа:* 60 хвілін.

*Месца правядзення майстар-класа:* вучэбная аўдыторыя.

*Матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне:* дошка (фліпчарт), камп'ютар, прэзентацыя ў PowerPoint, лісты паперы, маркеры на кожнага з прысутных.

**Ход майстар-класа**

*Арганізацыйная частка – 10 хвілін.*

Вядучы: Добры дзень, паважаныя калегі! Рада Вас вітаць сёння ў нашай навучальнай установе (подпіс каляровых палочак – прозвішча, імя, імя па бацьку).

Вядучы: Адкажыце, калі ласка: Ваша раніца сёння пачалася з кубачка кавы? Вы гатовы адкрыць для сябе нешта новае? (Зваротная сувязь.)

Вядучы: Як казаў амерыканскі філосаф і педагог Джон Дзьюі, мы забіраем ў дзяцей будучыню, калі прадаўжаем вучыць сёння так, як вучылі гэтаму ўчора. Жыццё змяняецца з фантастычнай хуткасцю. Аб'ёмы інфармацыі павялічваюцца штогод удвая. Дзеці не расстаюцца са сваімі гаджэтамі, фактычна жывуць у сеціве. Але ці шмат змянілася ў нашай школе за сто апошніх гадоў? Таму пытанне, як вучыць, якія метады і тэхналогіі выкарыстоўваць, актуальнае сёння як ніколі. І я абрала для сябе стратэгію АА. З АА працую з 2016 года, паступова ўкараняла кожны этап навучання, пачынаючы з пятага класа.

*Асноўная частка – 40 хвілін.*

*1. Паглыбленне ў педагагічную праблему – 15 хвілін.*

Вядучы: Ці знаёмы вы з формай работы – урок для дарослых? (Зваротная сувязь праз «святлафор»: зялёны – разумею, ведаю; жоўты – сумняваюся, чырвоны – не разумею, не ведаю.).

Урок для дарослых – гэта метадычная работа, якая дазваляе вядучаму не толькі расказваць, але паказваць, як працуюць сродкі, прыёмы, тэхнікі АА, удзельнікам даецца магчымасць паставіць сябе на месца вучня і адчуць на сабе, як працуе той ці іншы прыём ці метад, а назіральнасць вучыць бачыць і фіксіраваць факты.

Вядучы: Сфармулюйце мэты: чаму Вы тут, чаму вы хочаце навучыцца? Нагадваю аб тым, што мэта павінна быць канкрэтнай, дасягальнай. (Зваротная сувязь. Заслухаць праз лёсаванне (каляровыя палосачкі).)

Вядучы: На аснове чаго павінна быць дасягнута мэта? Наша сустрэча будзе паспяховай, а ў гэтым нам дапамогуць крытэрыі поспеху або наша цудоўнае слова НаШтоБуЗу – НА ШТО БУДУ ЗВЯРТАЦЬ УВАГУ:

1. Растлумачу, што такое АА і прывяду 3 аргументы на карысць яе актуальнасці ў сучасным свеце.
2. Пералічу асноўныя элементы АА.
3. Змагу ацаніць магчымасці выкарыстання АА ў сваёй практычнай дзейнасці.

*2. Работа па тэме майстар-класа – 25 хвілін.*

Вядучы: АА – стратэгія навучання, у межах якой вучні маюць магчымасць бачыць і разумець свае поспехі, памылкі, кіраваць асабістым навучаннем, валодаць рознымі прыёмамі ацэнкі.

Гэта інтэрактыўная тэхналогія, якая грунтуецца на зваротнай сувязі паміж: вучнямі, настаўнікам і вучнямі, вучнямі і іх бацькамі, настаўнікам і бацькамі. Паколькі ад правільнай пастаноўкі мэты будзе залежыць поспех урока, то можна вылучыць вельмі добры спосаб пастаноўкі мэты.

Плануецца, што да канца ўрока:

- Вучні будуць ведаць ……
- Вучні будуць умець …..
- Вучні змогуць …..

Заданне: сфармулюйце мэту мовай вучняў да тэмы ўрока: Зваротак. Неразвітыя і развітыя звароткі, іх выдзяленне ў вусным і пісьмовым маўленні.

Вядучы: Дзеці розныя, матывацыя да працы таксама розная, таму абмеркоўваем мэту ў парах (1, 2, 4). Прымяняем прыём – вольны мікрафон, дзе прагаворваем, што будем рабіць на ўроку. (Зваротная сувязь, лёсаванне.)

Вядучы: Калі прадоўжым гэтую тэму, то абавязковым стане ключавое пытанне, да якога мы звяртаемся на працягу ўрока. Зваротак – самы яркі этыкетны знак! Згодны ці не? Чаму? (Прыклад тэхнікі задавання пытанняў.)

Заданне: намалюйце тое, што асацыіруецца са школай.

(Ацэньваю. Увага на рэакцыю. Чаму? Абавязкова трэба ведаць крытэрыі ацэньвання або НаШтоБуЗу (звужае мэту). Гэта дапаможа ў правільным выкананні задання.)

Вядучы: Звяртаемся да нашай тэмы. Вызначце крытэрыі ацэньвання.

НаШтоБуЗУ (на што буду звяртаць увагу):

1. Ці умею: адрозніць сказы са звароткамі;

- правільна інтанаваць сказы са звароткамі і раставіць знакі прыпынку.

2. Прывяду па два прыклады з развітымі і неразвітымі звароткамі.

3. Прывяду прыклады ўжывання зваротkaў у тэкстах афіцыйнага стылю, гутарковага стыляў.

Вядучы: Асаблівая ўвага надаецца фарміраванню ў вучняў пры навучанні беларускай мове чытацкай пісьменнасці. Працуючы з тэкстам, вучні маюць магчымасць не толькі засвоіць

сістэмны характар беларускай мовы, папоўніць свой слоўнікавы запас, але і пазнаць гісторыю беларускага народа, навакольнае жыццё, узбагаціць эмацыянальную сферу.

Заданне: Напішыце пісьмо.

**НаШтоБуЗу:**

1. Ваша пісьмо складаецца з зачыну, інфармацыйнай часткі і заканчэння.
2. Зачын уключае развіты зваротак.
3. Інфармацыйная частка (3–4 сказы). Адзін са сказаў з аднароднымі членамі сказа.
4. Заканчэнне – подпіс ў канцы пісьма.
5. Пры напісанні пісьма берацe пад увагу напісаныя ніжэй абставіны.

1-я група. Ваша задача напісаць пісьмо сябру, з якім вас звязвае шматгадовае сяброўства.

2-я група. Ваша задача напісаць пісьмо сваёй бабулі.

3-я група. Напісаць пісьмо дырэктару прадпрыемства, на якое хочаце ўладкавацца на працу.

Узаемаацэнка паміж групамі ў вуснай форме з апорай на НаШтоБуЗу да напісання пісьма.

Адным са спосабаў праверкі дасягнення мэтаў урока можа быць лічбавы дыктант. Калі сцверджанне правільнае, праста́ўляецца лічба 1, калі не – 0.

*Заключная частка майстар-класа – 10 хвілін.*

Вядучы: у каханні і на вайне ўсе сродкі добрыя – гэта датычыцца ўкаранення новых метадаў у школьнай адукацыі (тэхналогія АА).

Вызначце тыя пачуцці, якія вы адчулі напрыканцы майстар-класа (зваротная сувязь «святлафор» і аргументуйце свой адказ з дапамогай фразеалагізмаў: А – светлая галава, Б – з душой і аганьком, в – гарыць галава або пустая галава, Г – ваш варыянт.

Вядучы: Паважаныя калегі, хачу яшчэ раз падкрэсліць, што АА дапамагае ў сучаснай сітуацыі забяспечыць фарміраванне ў вучняў моўнай кампетэнцыі, садзейнічае развіццю ў іх ініцыятыўнай здольнасці да самастойнага вырашэння праблем, да камунікатыўных і інфарматыўных навыкаў, а таксама павышэнню адказнасці за ўласнае навучанне. Дзякуй за ўвагу.

Такім чынам, урок для дарослых з’яўляецца не толькі эфектыўная формай азнаямлення педагогаў з асаблівасцямі выкарыстання стратэгіі актыўнай ацэнкі на ўроках беларускай мовы, але і з іншымі тэхналогіямі навучання ў сучаснай школе.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Актыўная ацэнка : метадычны дапаможнік беларускага настаўніка дапам. / укл. Н. Ільініч.– Мінск, 2011. – 83 с.
2. Актыўная ацэнка ў дзеянні: вопыт настаўнікаў Беларусі : дапаможнік для настаўнікаў / М. І. Запрудскі, М. В. Кудзейка, Т. П. Мацкевіч і інш.; пад рэд. М. І. Запрудскага. – Мінск, 2014. – 238 с.
3. Запрудский, Н. И. Современные школьные технологии-3 / Н. И. Запрудский. – Минск : Сэр-Вит, 2017. – 168 с.

УДК 316.6

# ГРУППОВЫЕ ТЕХНОЛОГИИ КАК ИНСТРУМЕНТ ВДОХНОВЛЯЮЩЕГО ОБУЧЕНИЯ

*В. С. Белевич,*
Белорусский государственный педагогический университет
имени Максима Танка, Республика Беларусь,
e-mail: slusalet@mail.ru

В статье представлен один из методов интерактивного обучения – фасилитация. Данная технология рассматривается как профессиональная организация процесса групповой работы, которая направлена на достижение поставленных целей занятия; на нахождение решения задач повышенной сложности и важности в процессе обучения; на создание благоприятной и комфортной обстановки обучения взрослых. Даётся определение, описывается суть метода, формулируются цели и принципы его использования, а также приемы метода.

**Ключевые слова:** интерактивное обучение, фасилитация, принципы, цели фасилитации, современная образовательная среда, преподаватель-фасилитатор, преимущества фасилитации, технологии фасилитации.

The article discusses one of the methods of interactive learning – facilitation. The core moments of the method are described, the goals, principles and techniques of the method are formulated. The possibility of ad-